Вазовікаў, У. Крылатыя выратавальнікі / У. Вазовікаў // Віцебскі рабочы. — 1990. — 15 лютага. — С. 4.

КРЫЛАТЫЯ ВЫРАТАВАЛЬНІКІ

Імем Леаніда Бяліцкага названа адна з вуліц Віцебска. Капітан-верталётчык, кавалер ордэнаў Леніна і Чырвонай Зоркі, ён зрабіў у Афганістане больш 700 баявых вылетаў. З апошняга задання Леанід Бяліцкі вярнуўся на Радзіму у «чорным цюльпане» – жалобна вядомым самалёце, на якім вазілі дамоў загінуўшых савецкіх салдат. Пахаваны ён побач з баявым таварышам Алегам Тувальскім на гарадскіх могілках «Мазурына».

На мітынгу ў гонар салдат, выканаўшых інтэрнацыянальны абавязак, многія бачылі, як першы сакратар Віцебскага абкома партыі У. В. Грыгор'еў і старшыня гарвыканкома М. А. Федарчук абдымалі невысокую жанчыну ў зялёным паліто з заплаканымі вачыма, гаварылі ёй цёплыя словы спачування, удзячнасці за сына-героя... То была маці згарэўшага ў небе Афганістана верталётчыка Бяліцкага – Ефрасіння Пятроўна. Гэта ёй прыслаў сваю кніжку «Гранатавая квецень» ваенны журналіст Уладзімір Вазовікаў з нарысам, урывак з якога мы прапануем увазе чытачоў.

Кожнаму з нашых лётчыкаў, хто працаваў у Афганістане, выпадала нямала гарачых дзён, і ўсё ж той летні дзень асабліва ўрэзаўся ў памяць верталётчыкаў экіпажа Леаніда Мікалаевіча Бяліцкага. Ды калі б толькі ў іх памяць! Ужо з раніцы ў паветры адчувалася незвычайная спёка. Летам на афганскім высакагор'і жорсткае, знясільваючае сонца, але звычайна варта ўвайсці ў цень, як пакутлівая спёка адпускае. А тут спёкай дыхала само паветра, слупок тэрмометра

пагражаў пераваліць за адзнаку «50». Капітану Бяліцкаму падумалася: цяжкім транспартнікам нялёгка цягнуць сёння поўны груз. Узляцелі, аднак, упэўнена, набралі зададзены эшалон. Магутныя Мі-6 дастаўлялі ў аддалены раён рэспублікі гаручае і прадукты. Іх суправаджала звяно манеўраных «васьмёрак», у саставе якога ляцеў і намеснік камандзіра эскадрыллі па палітчасці капітан Бяліцкі. Экіпажы ў суправаджэнне былі адабраны спрактыкаваныя, знаёмыя з кожнай пляцоўкай у абшарнай навакольнай зоне – ад скальных снегавых вышынь Гіндукуша да камяністых пустынь перадгор'я і зялёных субтрапічных аазісаў. Усе яны ўпэўнена ляталі ў гарах не толькі пры ясным надвор'і, але і калі ў паветры доўгімі гадзінамі вісіць малочная заслона пылу, калі стаяць зімовыя туманы і золкая імжа. Для гэтых лётчыкаў няма слова «немагчыма», бо жывуць яны па слову «трэба».

І вось чарговы вылет. Унізе – зацягнутыя шызай смугой плямы зялёных аазісаў, рассыпаныя цаглінкі пабудоў, дзівосныя лініі дувалаў. Узнімаюцца лабастыя шэрыя сопкі, змяяцца ў нізінах сухія рэчышчы і ледзь бачныя стужачкі дарог, блізка плывуць аграмадзіны аголеных хрыбтоў, і зноў – зялёныя плямы аазісаў у далінах, агароджаных няроўнымі сухімі хрыбтамі. Увайшлі ў раён, дзе вінтакрылыя машыны неаднаразова траплялі пад абстрэл. Пілоты ўзмацнілі ўвагу, углядаючыся ў шэра-жоўтыя грабяні і цені распадкаў. Ужо хрыбты заставаліся ззаду, няроўны схіл у палосках і плямах ценяў быццам правальваўся, і наперадзе рассцілалася новая даліна, калі Бяліцкі пачуў у навушніках трывожны голас лётчыка-штурмана Алега Тувальскага.

– Камандзір! Унізе, злева...

– Бачу! – коратка адказаў Бяліцкі.

Ледзь бачныя ў сонечным паветры вогненныя іскаркі імкліва вырываліся з цяністага распадку на схіле гары і несліся да строю машын. Біў буйнакаліберны зенітны кулямёт. А вось яшчэ адзін ланцужок вогненных кропелек, якія быццам выцягваюцца ў палёце. Значыць, ёсць і другі. Успышак кулямётных выстралаў Бяліцкі не бачыў, але пазіцыі душманскіх зенітчыкаў ён беспамылкова ўгадваў па напрамку трас, і так выразна ўяўляліся барадатыя людзі ў брудных чалмах, якія па-зладзейску мітусіліся каля зенітных установак, што нават зубамі скрыгануў. Цэляць па транспартных машынах, падонкі. І мішэнь буйнейшая, і манеўраваць з грузам вялікаму верталёту цяжка. А ведаюць жа, што на гэтых машынах возяць газу для кішлакоў, дзе няма электрычнасці, бензін для аўтамабіляў, муку, цукар, крупы для галодных, медыкаменты для хворых, кнігі для школьнікаў. Ды што казаць! Той, хто здольны падсунуць міну ў дзіцячы кінатэатр, канечне, цвёрдай рукой накіруе ракету або кулямётную чаргу ў пралятаючую машыну, нават з пасажырамі на борце.

– Гадзючае гняздо!–голас старшага лейтэнанта Алега Галінскага, борттэхніка экіпажа, выдаваў ледзь стрыманую злосць. – Амаль кожны раз тут страляюць. Ці раздавяць гэта логава калі-небудзь?

– Абавязкова, Алежак,– азваўся Бяліцкі. – У гэтым можна не сумнявацца.

– Будзем спадзявацца, – буркнуў Тувальскі. – Толькі баюся, як бы яны да таго не прызямлілі тут нашу машыну з пасажырамі.

Хоць зенітныя трасы прайшлі скрозь строй транспартных машын, на гэты раз, здаецца, абышлося. А разрэджанае паветра быццам выгарала ад сонечных праменяў і блізкасці распаленых каменных аграмадзін – Бяліцкі адчуваў гэта па цяжкаму дыханню рухавіка сваёй «васьмёркі». Між іншым, запас сілы ў яе пакуль яшчэ немалы, можна б узняцца і вышэй, але як сябе адчуваюць цяжкія «шостыя»? Іх рухавікі, праўда, больш магутныя, але ж і загружаны пад

столь.

Унізе цяпер цягнулася горная даліна, на пакатым дне яе там і тут – вялізныя плямы «зялёнкі», процілеглы схіл гары ўступамі ўзнімаўся ўверх, на вузкіх тэрасах зелянелі маладыя пасевы бахчы і вінаграднікі, залацілася выспяваючае збожжа. Вочы пілотаў адзначалі перастаяўшыя палі, расла трывога ў душы. Якая дарагая зямля ў горным краі, якая вялікая сялянская праца, затрачаная на тое, каб горныя тэрасы сталі ўрадлівымі палямі, каб арашала іх вільгаць, каб вырас на іх хлеб, і якая марнатраўная вайна, што ў адно імгненне знішчае плён дяесяцігоддзяў! Чаму ў пару жніва не відно людзей на тэрасах? Дзе гаспадары нязжатых палёў? Сагнаны ў банды басмачоў? Забіты? Пайшлі ў гарады? А можа, пахаваліся, пакуль салдаты выганяюць прышлых бандытаў?

«Шасцёрка», што ляцела ў сярэдзіне калоны, дала прасадку раптоўна, і адразу стала прыкметна, якая цяжкая яна і грувасткая ў параўнанні з манеўранымі «васьмёркамі». Трывожны голас прагучаў у эфіры:

– Я – Дваццаць шосты! Рухавік дае збоі. Магчыма пашкоджанне. Іду на вымушаную!

Камандзір атрада яшчэ не адказаў, калі ў эфіры пачуўся голас Бяліцкага:

– Я – Дванаццаты! Дваццаць шостага бяру на сябе!

– Зразумеў цябе, Дванаццаты, – азваўся роўным голасам камандзір. – Дзякуй.

«Дзякуй» – гэта значыць: веру, што ты не толькі не пакінеш у бядзе сяброў – такое ў нас проста не ўяўляецца! – ты зможаш дапамагчы ім лепш, чым хто-небудзь іншы. Тут, у Афганістане, добраахвотнікаў на небяспечныя справы заўсёды хапае, але першачарговае права даецца тым, хто сапраўды здольны выканаць задачу з найменшымі стратамі, а лепш – без страт.

Анямелая, ляжала ўнізе даліна, бясформенныя плямы «зялёнкі» разрасталіся – да чаго яны былі бяскрыўднымі на першы погляд, платанавыя і таполевыя шатры, якія абяцаюць цень і прахалоду! Што ўсё ж з рухавіком «шасцёркі» – варожае пападанне або стомленасць ад спякоты і разрэджанага паветра? А можа, і адно і другое разам? У такім выпадку застаецца надзея, што паблізу зямлі рухавік набудзе новае дыханне і ўдасца дацягнуць да цэлі, хоць бы і ў аблёт горнага хрыбта.

Аднак вельмі хутка ён зразумеў: вымушанай пасадкі не мінаваць. Вінтакрылы атрад знік за хрыбтом, над далінай цягнуліся цяпер толькі дзве машыны. Бяліцкі раптам пераж ыў пачуццё параненай птушкі, якая адстала ад сваёй чарады. Але было яно імгненным – уся ўвага яго сканцэнтравалася на «дваццаць шостым».

– Пастарайся перацягнуць «зялёнку», – падказваў ён камандзіру аварыйнага верталёта. – Там ёсць падыходзячая пляцоўка. А дацягнеш да тэрасы, хоць бы ніжняй, – будзе проста выдатна!

Выдатна не будзе пры самай удалай пасадцы – гэта Бяліцкі ведаў. І ўсё ж, па-чалавечы разлічваючы на лепшае, ён не падазраваў, што наперадзе – найгоршае: яны цягнулі ў самае логава душманаў.

Зямля набягала ўсё хутчэй, і, як ні стараўся «дваццаць шосты», пераскочыць «зялёнку» яму не ўдалося.

– Усяму экіпажу неадкладна пакінуць верталёт! Бягом на пляцоўку! У грузавым адсеку пажар.

У любое імгненне транспартны верталёт магло ахапіць полымя. Тры тоны гаручага – такая бомба, ад якой і «васьмёрцы» трэба трымацца як мага далей.

Разварочваючыся, Бяліцкі ледзь паверыў вачам: у якой-небудзь паўсотні крокаў ад машыны,

што прызямлілася, на нешырокай прагаліне сярод зараснікаў, задзіраўся ўверх шышкаваты, у кольцавых рэбрах ствол буйнакалібернага кулямёта, а вакол яго мітусіліся людзі ў брудна-шэрых чалмах і карычневых пакамечаных безрукаўках. Там-сям у зараснікаx мільгацелі тыя ж карычневыя безрукаўкі і чалмы – своеасаблівая уніформа некаторых душманскіх атрадаў, што пранікаюць у краіну з Пакістана.

То была мінута – нават не мінута, а імгненне, – калі правяраюцца ўсе якасці воіна. Дзеля гэтага імгнення былі доўгія дні, месяцы, гады вучобы, трэніровак, палётаў, загартоўкі цела і волі, спасціжэння сябе самога і спасціжэння тэхнікі, якая ў руках.

Напэўна, усё ж не выпадкова Бяліцкаму нароўні з камандзірам эскадрыллі маёрам Герцавым давалася першачарговае права ісці на рызыкоўныя справы.

«Васьмёрка» вісела, разварочвалася ў якіх-небудзь пяцідзесяці метрах ад зямлі – ідэальная цэль для душманскіх зенітчыкаў, але ён ужо адагнаў мільгануўшую думку – пайсці на фарсажы ўверх, у бок, ад расстрэлу ва ўпор, хоць бы засланіцца ад кінжальнага агню кронамі дрэў. Але што будзе з таварышамі? Яны, здаецца, не падазраюць аб суседстве ворагаў. Рашэнне Бяліцкі прыняў у тое самае імгненне, калі ўбачыў пад сабой кулямётнае гняздо.

Потым, у адказ на пытанне: што ён адчуваў, аб чым думаў, збіраючыся раздавіць куляметнае гняздо верталётнымі коламі? – Бяліцкі пацісне плячамі і, ледзь усміхнуўшыся, скажа: «Аб чым там думаць? Сачыў за зямлёй. Чакаў...».

Чакаў чаргі ва ўпор, што распорвае машыну, чакаў сутыкнення.

Напэўна, пачуцці Леаніда Бяліцкага зразумеюць толькі лётчыкі Вялікай Айчыннай вайны, якія ішлі на таран варожага бамбардзіроўшчыка, навісалі вінтом «ястрабка» над чужым кілем са свастыкай і бачылі наведзеныя ва ўпор дулы «эрліконаў». Напэўна, як і яны, Бяліцкі падсвядома помніў аб тым, што нервы ў варожага стралка не жалезныя, і прымаў у разлік гэты шанц нароўні з іншымі.

...Жах раскідаў душманаў, як вецер ад вінтоў размятае пажоўклае лісце. Бяліцкі падаўся крыху ў бок і завіс ля самай зямлі. З адкрытага люка дэсантнай кабіны выскоквалі аўтаматчыкі. Праз мінуту душманская зенітка разам з іншай пакінутай зброяй і боепрыпасамі аказалася на борце машыны. «Васьмёрка» рэзка пайшла ў гару.

Транспартны верталёт цяпер густа дыміў, і ўжо полымя прабівалася вонкі. Напэўна, у іншых умовах можна было б паспрабаваць знішчыць ачаг пажару, пранікнуўшы ў грузавы адсек праз пілоцкую кабіну – адкрываць грузавы люк у такіх выпадках нельга, паветра імгненна раздзьме агонь, – але гэта ў іншых, мірных умовах. Дэсантнікаў на борце «васьмёркі» – няпоўнае аддзяленне, а душманаў ён толькі сваімі вачыма бачыў – не менш двух дзесяткаў. Колькі іх яшчэ хаваецца ў зараснікаx? Без страт ужо не абысціся, дык няхай жа яны будуць як мага меншымі.

Экіпаж аварыйнай «шасцёркі», выканаўшы яго загад, заняў абарону са знятым бартавым кулямётам ля самага краю зараснікаў. Машына Бяліцкага быццам зрабіла рыкашэт, дакрануўшыся да зямлі, – гэтага было дастаткова, каб сябры аказаліся ў кабіне, падхопленыя рукамі дэсантнікаў, – і зноў вышыня імкліва нарастала паміж «васьмёркай» і распаленай зямлёй. Душманы паспелі апомніцца – адусюль зашчоўкалі вінтоўкі, затрашчалі аўтаматы.

– Пазнавата спахапіліся, сволачы! – весела вылаяўся Тувальскі. – Вунь як спёка іх размарыла, праспалі сваю зенітную моц.

Быццам шэрая пража выкінулася з-пад вузкага крыла верталёта, і сярод «зялёнкі», там, дзе

дыміла аварыйная машына, выбухнуў вялізны смерч чырвонага агню і чорнага дыму. Пакуль «васьмёрка» не знікла за хрыбтом, экіпаж бачыў ззаду, у смузе бездані даліны, высокі слуп полымя. Колькі горных кішлакоў мог бы асвятліць і абагрэць у зімовыя халады гэты касцёр! Аб згарэўшай машыне Бяліцкі стараўся не думаць. Хоць была яна старэнькая, яе, напэўна, аплаквалі ў душы лётчыкі экіпажа, якія сядзелі цяпер пасажырамі ў дэсантнай кабіне. Ну што ж, таго, што здарылася, не зменіш. Злей будуць працаваць рабяты. Галоўнае ўсё ж у тым, што ўсе жывыя і здаровыя.

Менавіта гэта, апошняе, сказаў камандзір атрада, сустрэўшы экіпаж Бяліцкага ля верталётаў, што разгружаліся. Але заставалася пытанне, якое не давала спакою многім: што ж адбылося з загінуўшай «шасцёркай» у палёце? Рассеяць прыгнечаны настрой пацярпеўшага аварыю экіпажа Бяліцкаму не ўдалося, і на разборы палёту ён папрасіў слова.

– Таварыш маёр, мы параіліся ў сваім экіпажы і вось што надумалі: просім камандаванне дазволіць нам злятаць на месца аварыі. Паспрабуем там ва ўсім разабрацца.

Стала ціха. Потым хтосьці спытаў:

– А калі душманы наладзяць засаду? На ўсякі выпадак?

Бяліцкі ўсміхнуўся:

– У іх там ужо была засада. Мы ж таксама тое-сёе ўмеем.

– Добра. Бяліцкі, падумаем аб вашай просьбе, – адказаў камандзір. Ён памаўчаў і ўсміхнуўся: – А каб уся слава адным вам зноў не дасталася, я, мусіць, палячу ў пары.

– За славай мы не гонімся, – пажартаваў Бяліцкі. – Дарагая ісціна, а славу падзелім.

І яны зляталі на месца аварыі. І нават прывезлі абгарэлы рухавік «шасцёркі», хоць давялося вытрымаць цэлы бой з душманамі. Ісціну высветліла бранябойная куля, якая засела ў адной з сістэм рухавіка.

– Дзякуй табе, Лёня, – дзякавалі Бяліцкаму пілоты і тэхнікі згарэўшага верталёта. – Цяпер у нас сумленне чыстае.

Дзеля такой падзякі варта было рызыкаваць.

Адразу пасля палёту экіпаж атрымаў адначынак. Спаць ляглі раней. Спалі моцна – так спяць людзі, якія добра папрацавалі. І не чулі, як трывожна хутка, але ціха, каб не разбудзіць іх, збіраўся ў начны палёт экіпаж камандзіра эскадрыллі. Прывычныя да маторнага гулу, не пачулі яны і ўзлёту вінтакрылай пары, якая пайшла ў начныя горы, дзе завязаўся жорсткі бой жменькі дэсантнікаў з паўтарасоценнай бандай.

«Нашы крылатыя выратавальнікі, паільцы і кармільцы», – гэтыя словы, што прагучалі на апаленай сонцам і сухавеямі сопцы, куды верталёты дастаўлялі ваду, хлеб і пошту для вартавога паста, і падагналі мяне ў дарогу да бліжняга аэрадрома, дзе размяшчалася верталётная эскадрылля. Можа, там удасца нешта даведацца аб верталётчыках, якія адшукалі тады ў начных гарах дэсантнікаў старшага лейтэнанта Кавалёва. Вось ужо дзе яны аказаліся сапраўднымі выратавальнікамі...

Спадарожнік мой, палітработнік, які добра ведаў людзей эскадрыллі, расказваў дарогай:

– Калі самі ўбачыце іх работу, напэўна, падумаеце: людзей у эскадрыллю спецыяльна адбіралі. І памыліцеся. Людзі тут такія ж, як усюды, а між тым за ўвесь час службы ў Афганістане на сумленні лётчыкаў – ніводнага сарванага задання. Ніводнага, разумееце? Ні малейшага! А што за фактам? А за ім – камандзір і яго падначаленыя. Хто лепшыя лётчыкі ў эскадрыллі? Маёр

Герцаў, яго намеснік па палітычнай часці капітан Бяліцкі, сакратар партарганізацыі капітан Платонаў. Пры гэтым заўважце: і нампаліт, і партыйны сакратар – вядучыя верталётных пар, а камсамольскі сакратар Коля Обухаў – лепшы штурман звяна. Мне давялося быць сведкам вучэбнага дэсантавання на горныя пляцоўкі, якія ляжаць ля самай-самай столі. Вы бачылі калі-небудзь, як верталёт вісіць над безданню, чапляючыся адным колам за край скалы? А потым, каб набыць устойлівасць і паляцець, яму трэба літаральна зваліцца ў бездань. І ўжо пры падзенні ён, як кажуць, становіцца на крыло. Не бачылі? Паспрабуйце хоць бы ўявіць! Дык вось, хто садзіўся на тыя пляцоўкі першым? Зноў жа – Герцаў, Бяліцкі, Платонаў. Кажуць, асабісты прыклад – сіла. Але ён таму і сіла, што дае маральнае права з іншых патрабаваць. Гэтыя трое самі больш за ўсіх працуюць і вучацца. І ўвесь час вывучаюць людзей. А калі камандзір, палітработнік, партыйны і камсамольскі сакратар ведаюць, каму лепш даверыць адну справу, а каму – другую, хто са спрактыкаваных пілотаў, штурманаў, тэхнікаў можа стаць настаўнікам для малодшага, а хто не можа, запэўніваю вас: у такім падраздзяленні справа пойдзе. Сакрэт у іх, як бачым, просты.

– Ды прастата ў яго няпростая.

– Гэта правільна. З людзьмі ўсё складана. З імі трэба працаваць і працаваць. Тут працуюць. Экіпаж – гэта калектыў, у нас у адзіночку не пагеройствуеш. Абавязкова пагаварыце з Герцавым і Бяліцкім. З абодвума. Пераканаецеся: гэта людзі па-сапраўднаму сучасныя – працаўнікі.

– Значыць, абібокі несучасныя.

– Так. – Субяседнік адказаў без усмешкі. – Абібокі заўседы несучасныя. Тут гэта асабліва прыкметна. Тут гультаёў асуджаюць адкрыта. Меркі ў нас франтавыя: сядзець за чужой спінай – шкурніцтва. Калі чалавеку раз і другі не даверылі сур'ёзнага задання, я вам скажу: такому не пазайздросціш. Ужо ён у блін разаб'ецца, каб трэці раз яго не абышлі.

– А лётчыкі эскадрыллі начамі ў гарах лятаюць?

Цяпер субяседнік засмяяўся – напэўна, ад наіўнасці майго пытання.

– Вы іх самі распытайце...

На гэты раз пашанцавала: і Герцаў, і Бяліцкі аказаліся на месцы. Нечым яны былі падобныя адзін на аднаго. Можа, няспешнасцю рухаў і ледзь перавалістай хадой, характэрнай для лётчыкаў і маракоў, асабліва, калі яны «дома», сярод сваіх. Да таго ж камандзір і нампаліт амаль равеснікі. Герцаў стрыманы, нешматслоўны, у ім адразу адчуваеш воіна. Бяліцкі таксама гаворыць мала (можа, пакуль прыглядваецца да чалавека), але ў ім адразу адчуваеш сардэчную адкрытасць. Вядома, тут адыгрывае ролю і прафесія – ён жа палітработнік. Бяліцкі, напэўна, з тых, хто пры сустрэчы ўмее першым усміхнуцца незнаёмаму, выклікаючы ў людзей давер. Цяжка нават уявіць, што гэтыя ясныя вочы столькі разоў бачылі смяртэльную небяспеку. Нават у светла-блакітным лётным касцюме ён быў падобны не на воіна, а хутчэй – на настаўніка або доктара.

Бяліцкі паказваў мне размяшчэнне эскадрыллі. Утульныя жылыя кубрыкі, экіпажы тут працуюць і жывуць па-сямейнаму, ніколі не разлучаючыся. Ложкі акуратна прыбраныя, на століках – часопісы і кнігі, прыёмнікі і магнітафоны, ёсць нават цветамузыка, зробленая рукамі саміх лётчыкаў. Ад Бяліцкага я даведаўся, што ў іх ідзе спаборніцтва за лепшы кубрык, ленінскі пакой, месца адпачынку. Нават курылкі тут асаблівыя – з маленькімі праточнымі басейнамі, населенымі жывымі істотамі. У жылых кубрыках і ленінскім пакоі мы ўсякі раз міжволі затрымліваліся ля малюнкаў дзяцей, прысланых з дому. Над ложкам Бяліцкага – партрэт маладой жанчыны з дзіцем.

– Мае, – сказаў Леанід. – Наташа і Кацюша. Сталі часта сніцца. І маці з бацькамі. А нядаўна дзед прысніўся. – Леанід памаўчаў. – Дзіўны нейкі сон. Я дзеда такім ніколі не бачыў: у паўшубку, у шапцы з зоркай і аўтаматам ППШ у руцэ. Махае мне, быццам за сабой кліча..: Дзед Марк у мяне быў гераічны – беларускі партызан...

– Леанід Мікалаевіч, – спытаў я Бяліцкага, – ці не вы гэта часам выручалі нядаўна ў гарах групу дэсантнікаў, акружаную бандай? Вельмі там рабяты захапляліся работай лётчыкаў. А захапленне дэсантнікаў чаго-небудзь вартае. Бяліцкі ўсміхнуўся:

– Шкада, але іх захаплення заслужыў не я. Вы камандзіра эскадрыллі нашага распытайце або капітана Лук'яненку – яны тады працавалі.

І вось што мне расказалі.

Калі сярод ночы маёру Герцаву паведамілі аб групе нашых воінаў, якія трапілі ў душманскую пастку, ён адразу рашыў ляцець сам, са сваім вядомым. Таму што хутка адшукаць у вялізных, затопленых цемрай гарах адзіную вяршыню здольны не кожны нават спрактыкаваны пілот. А знайсці трэба хутка.

Праз некалькі мінут пара верталётаў на чале з камандзірам выйшла ў разліковую кропку, і лётчык-штурман эскадрыллі капітан Сяргей Касіцын вылічыў напрамак на цэль. У экіпажы капітана Анатоля Лук'яненкі лётчык-штурман Віктар Жыгадла вёў свае разлікі – у сляпым палёце па прыборах узаемны кантроль яшчэ нікому не пашкодзіў...

Над ліхтарамі кабін мерна гойдаўся зорны купал, цяжкая глухая цемра без адзінага агеньчыка цякла ўнізе. Па патухшых зорках угадвалі высокія пікі гор, што заступалі верталётам дарогу. Трымаць гранічную скорасць палёту было нельга – з гэтым у начных гарах даводзіцца мірыцца.

Лётчыкі не ведалі дакладнай абстаноўкі на гары, дзе знаходзілася група дэсантнікаў, якая запрасіла дапамогі, аднак меркавалі: камусьці давядзецца садзіцца на незнаёмы пятачок, каб узяць людзей.

У разліковы час убачылі кароткія ўспышкі – быццам нехта чыркаў адсырэлымі запалкамі па дне гіганцкага калодзежа, і распаленыя трасы чэргаў скрыжоўваліся ў адным месцы: душманы вялі агонь па вяршыні гары. У тую ж мінуту радыст дэсантнікаў пацвердзіў, што Касіцын беспамылкова вывеў машыны ў патрэбнае месца.

Гірлянды САБаў запаліліся ў небе, іх чырванаватае святло, патушыўшы зоркі, асвяціла незнаёмую гару, чорным правалам ляжала за ёй цясніна. З плоскай макушкі гары адразу ж узмылі сігнальныя ракеты дэсантнікаў. Скінуўшы скорасць, вінтакрылая пара на невялікай вышыні пайшла ў аблёт гары.

Можа, у рассеяным святле САБаў сталі прыкметнымі сілуэты нізка ляцячых машын, або душманы дзейнічалі наўздагад, па гуку, – верхні схіл гары раптам апаясаўся частым ланцугом успышак, чырвоным патокам прашыла неба доўтая чарга буйнакалібернага кулямёта, намацваючы галаўны верталёт. І тады вогненныя стрэлы рынуліся з неба да зямлі, і зенітны кулямёт душманаў быццам захлынуўся.

Банда адступіла ад вяршыні ў цемру, але працягвала трымаць пазіцыю дэсантнікаў пад агнём. Садзіцца было нельга. Аднак уходзіць лётчыкі не збіраліся, пачалі баражыраванне. Амаль дзве гадзіны пара верталётаў кружыла пад гарой, час ад часу скідваючы САБы і сочачы за перамяшчэннем банды, – так арол і арліца абавязкова кружаць над сваім гняздом, аберагаючы яго

ад паўзучых гадзюк. Потым на змену, ужо праверaным шляхам, прыляцела другая пара. Гэта былі больш магутныя баявыя машыны, ахаваныя бранёй. Але якраз да іх прыходу ў цёмнай даліне прарэзалася слабае святло ад фар машын наземнай групы БТР, якая падаспела на дапамогу. Гаручага заставалася ў абрэз, і якім вялікім ні было жаданне лётчыкаў убачыць твары адважных таварышаў па зброі, Герцаў загадаў вяртацца на свой аэрадром.

Праз два тыдні, пакідаючы Афганістан, я аказаўся на тым жа аэрадроме. Хацелася наведаць верталётчыкаў, але да вылету заставаліся лічаныя мінуты. Ужо апусціўся пасадачны трап, калі пад'ехала група афіцэраў, у ёй былі двое ў авіяцыйнай форме. Вось ад іх я і пачуў, што напярэдадні, выконваючы складанае заданне, загінуў намеснік камандзіра верталётнай эскадрыллі па палітчасці...

Я не мог распытваць падрабязнасці. Я ведаў: ён загінуў, як воін, выконваючы абавязак і не адводзячы свайго яснага позірку ад зрэнкаў смерці. Мы былі знаёмыя з Леанідам Бяліцкім толькі некалькі гадзін, а здавалася – я страціў лепшага сябра. Міжволі думалася аб бацьку Леаніда, старым віцебскім рабочым, аб яго маці, аб той мілавіднай жанчыне з дзіцем, што глядзелі на нас з партрэта. З чым жа параўнаць іх страту?..

Але думалася мне і аб тых, каго Леанід Бяліцкі за сваё кароткае жыццё выратаваў ад гібелі, выручыў з жорсткай бяды. Няхай большасць гэтых людзей не ведае і, можа, ніколі не даведаецца імя свайго выратавальніка – вобраз чырваназорнай машыны, якая прыляцела на дапамогу ў самы цяжкі час жыцця, застанецца ў іх памяці да канца дзён, пяройдзе ў памяць блізкіх, уліваючыся жывой рысай у вобраз воіна, абаронцы і выратавальніка, у вобраз нашай арміі і нашага народа. Жыццё і смерць такіх людзей, як Леанід Бяліцкі, нясе ў сабе сілу прыкладу для ўсіх, хто працягвае дарогу жыцця і барацьбы за справядлівасць.

На здымку: Ефрасіння Пятроўна Бяліцкая ля магілы сына.

Фота В. ГАРБУНОВА.